*Я.Д.ГРЫГАРОВІЧ*

**У НЯСПЫННЫМ РУХУ**
**(да 30-годдзя Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў)**



Наведвальнікі Беларускага дзяржаў-нага універсітэта культуры і мастац-тваў, не знаёмыя з асаблівасцямі яго навучальнага працэсу, іншы раз здзіўляюцца, што тут у час заняткаў чуюцца то фартэпіянныя пасажы, то напеўная мелодыя баяна, а то і магутная музыка аркестра. На сцэне вучэбнага тэатра раздаецца драбнюткі цокат абцасаў. Многа яшчэ цікавага можа пачуць і пабачыць чалавек, не дасведчаны ў спецыфіцы навучання ў нашай ВНУ, адной з маладых у краіне.

Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў сёння – гэта шматпрофільная гуманітарная вышэй-шая навучальная ўстанова, нацыя-нальны навукова-педагагічны цэнтр даследавання, фіксацыі і трансляцыі набыткаў айчыннай і сусветнай культуры, які ажыццяўляе сваю дзейнасць на аснове гуманістычных традыцый нашага народа, дасягненняў сусветнай навукі і культуры. БДУ культуры і мастацтваў уяўляе творчую супольнасць прафесараў, дацэнтаў, выкладчыкаў, студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў, якія захоўваюць і развіваюць класічныя традыцыі універсітэцкай адукацыі, кіруючыся прыярытэтнымі агульначалавечымі культурнымі каштоўнасцямі.

Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў сфарміраваўся на базе Мінскага інстытута культуры, які пачаў дзейнічаць у 1975 г. у адпаведнасці з Пастановай Савета Міністраў БССР ад 4 мая 1975 г. і загадам Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР ад 14 мая 1975 г. А 30 верасня 1993 г. Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ён пераўтвораны ў Беларускі універсітэт культуры. 26 лістапада 1999 г. загадам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь універсітэт атрымаў статус вядучай вышэйшай навучальнай установы ў сістэме нацыянальнай адукацыі ў сферы культуры. Рашэннем Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта ад 22 сакавіка 2001 г. ён зарэгістраваны як установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры", з кастрычніка 2004 г. як установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў".

За 30 гадоў дзейнасці універсітэта дваццаць пяць тысяч выпускнікоў атрымалі дыпломы аб яго заканчэнні і працуюць практычна ў кожным куточку нашай роднай краіны. Яны памятаюць, шануюць, славяць сваю alma mater, прысвяціўшы сваё прафесійнае жыццё распаўсюджванню і аднаўленню беларускай культуры і мастацтва. У ліку іх вядомыя артысты беларускіх харавых, вакальных і эстрадных калектываў, лаўрэаты міжнародных фестываляў і конкурсаў, навукоўцы, педагогі, кіраўнікі аматарскіх і прафесійных калектываў, якія носяць ганаровыя званні «народны» і «ўзорны», міністры і супрацоўнікі міністэрстваў і ведамстваў, Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі, кіраўнікі буйнейшых устаноў сацыяльна-культурнай сферы і інш.

Сёння ва універсітэце амаль 5 тыс. студэнтаў, якія вучацца па 16 спецыяльнасцях і 47 спецыялізацыях на шасці факультэтах: культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці; традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва; музычнага мастацтва; інфармацыйна-дакументных камунікацый; завочнага навучання; павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў.

Самым старэйшым з'яўляецца факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый. За 60 гадоў існавання на ім падрыхтавана больш за 5 тыс. спецыялістаў, якія працуюць у навуковых, навукова-тэхнічных, спецыяльных, дзіцячых, публічных бібліятэках, кніжным гандлі, інфармацыйных цэнтрах, бібліятэках вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў.

Працэс навучання на факультэце культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці зарыентаваны на глыбокую агульнагуманітарную і культуралагічную падрыхтоўку спецыялістаў па сусветных адукацыйных стандартах. Ён праду- гледжвае вывучэнне сусветнай і нацыянальнай гісторыі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

філасофіі, сусветнай і айчыннай літаратуры, эстэтыкі, логікі, рэлігіі, тэорыі культуры і мастацтва, эканомікі і сацыялогіі культуры, замежных моў. Спецыяльнае навучанне студэнтаў на гэтым факультэце прадугледжвае засваенне ведаў, фарміраванне уменняў, навыкаў, неабходных для паспяховага правядзення арганізацыйнай, творчай і прадпрымальніцкай дзейнасці ў сферы культуры і вольнага часу.

Кафедры факультэта мастацкай творчасці падрыхтавалі не адну тысячу кіраўнікоў аматарскіх калектываў народнай, эстраднай і духавой музыкі.

У выніку рэарганізацыі ў 2003 г. структуры універсітэта быў сфарміраваны новы факультэт – факультэт традыцыйнай культуры і сучаснага мастацтва. Тэарэтычнай кафедрай факультэта з'яўляецца кафедра этналогіі і фальклору. Вялікай папулярнасцю ў студэнтаў карыстаецца кафедра народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. На факультэце студэнты атрымліваюць спецыяльнасці рэжысёра народных абрадаў і свят, рэжысёра самадзейных тэатральных калектываў, кіраўніка аматарскіх танцавальных калектываў.

У 2002 г. створаны факультэт павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў, які забяспечвае падрыхтоўку кадраў да працоўнай дзейнасці ў зменлівых сацыяльна-эканамічных умовах і тым самым садзейнічае эфектыўнаму развіццю грамадства. Работа на факультэце вядзецца па трох асноўных напрамках: перападрыхтоўка (атрыманне новай спецыяльнасці); павышэнне кваліфікацыі; дадатковыя адукацыйныя паслугі насельніцтву.

У агульнай сістэме падрыхтоўкі спецыялістаў мастацкай творчасці, культуралогіі, бібліятэкараў-бібліёграфаў вялікую ролю адыгрывае факультэт завочнага навучання. У 1996 г. адкрыты Мазырскі філіял гэтага факультэта для жыхароў Чарнобыльскага рэгіёну. У гэтым жа годзе па хадайніцтве Гомельскага аблвыканкама на базе Мазырскага музычнага вучылішча быў створаны філіял завочнага факультэта Беларускага універсітэта культуры, дзе рыхтуюць кіраўнікоў народных харавых калектываў, аркестраў і ансамбляў народнай інструментальнай музыкі. На навучанне туды прымаюць спецыялістаў, якія працуюць ва ўстановах культуры Гомельскай вобласці.

Універсітэт папулярны сярод насельніцтва, сведчаннем чаму з'яўляюцца высокія конкурсы сярод паступаючых да нас на працягу апошніх дзесяці гадоў. Выпускнікі універсітэта карыстаюцца вялікім попытам ва ўстановах культуры, адукацыі, мастацтва, сацыякультурнай сферы. На размеркаванні задавальняецца толькі частка паступіўшых ад дзяржаўных устаноў заявак. Так, у 2005 г. патрэба ў кіраўніках харэаграфічных калектываў забяспечана толькі на 50%, харавых народных калектываў – на 35%, патрэба ў бібліятэкарах – на 40% і г.д. Калі ўлічваць, што колькасць спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй у сферы культуры невысокая, то неабходнасць у спецыялістах гэтага профілю ў бліжэйшыя 20 гадоў будзе пастаянна расці, значыць, будзе расці і папулярнасць універсітэта пры ўмове яго далейшага актыўнага развіцця.

Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў імкнецца рыхтаваць спецыялістаў, якія адпавядаюць аб'ектыўным патрабаванням сучаснай сацыяльна-культурнай сферы. За кароткі час вучоныя універсітэта распрацавалі некалькі варыятнаў эксперыментальных вучэбных планаў, дзяржаўныя стандарты вышэйшай прафесійнай адукацыі. Прапанавана мадэль вышэйшай прафесійнай адукацыі, зарыентаваная як на сусветныя стандарты гуманітарнай адукацыі, так і на нацыянальна-культурныя асаблівасці развіцця Рэспублікі Беларусь. З улікам гэтага былі вызначаны асноўныя кірункі гуманітарнай падрыхтоўкі і базавыя вучэбныя дысцыпліны, распрацавана структура сацыяльна-гуманітарных ведаў.

Базавымі дысцыплінамі агульнапрафесійнай падрыхтоўкі кадраў для ўстаноў культуры і мастацтва з'яўляюцца псіхолага-педагагічныя, мастацтва- знаўчыя, метадалагічныя прадметы, якія знаёмяць студэнтаў з праблемамі функцыянавання і развіцця культуры, мастацтва, самадзейнай творчасці, з сістэмай мастацкай адукацыі і выхавання. Вызначаны дысцыпліны, якія звязаны з падрыхтоўкай будучых спецыялістаў да метадычнай работы ў сферы мастацкай творчасці і да дзейнасці ў сферы па арганізацыі і кіраванні мастацкай творчасцю. Вывучэнне такіх прадметаў, як менеджмент, эканоміка культуры, методыка арганізацыі мастацкай творчасці, планаванне і арганізацыя культурна-адпачынкавай дзейнасці, забяспечвае падрыхтоўку будучых спецыялістаў да працы ў клубных і пазаклубных установах.

Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў шмат увагі надае падрыхтоўцы студэнтаў да мастацкага кіравання творчымі калектывамі і аб'яднаннямі. З гэтай мэтай у вучэбных планах уведзены такія курсы, як гісторыя айчыннай і сусветнай мастацкай культуры, мастацтвазнаўства, музычна-тэарэтычныя (сальфеджыо, гармонія, поліфанія, гісторыя і тэорыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

музыкі), фальклярыстыка і інш. Вывучэнне названых прадметаў у іх узаемасувязі забяспечвае падрыхтоўку студэнтаў да выканання задач па арганізацыі аматарскай мастацкай творчасці.

У адпаведнасці з Канцэпцыяй развіцця вышэйшай адукацыі фундаментальная, гуманітарная, прафесійна-тэарэтычная падрыхтоўка студэнтаў спалучаецца са спецыяльнай практычнай падрыхтоўкай, якая найбольш актыўна праводзіцца з III курса. Гэта дазваляе азнаёміць студэнтаў з тэхналогіямі будучай прафесійнай дзейнасці, іх фунцыянальнымі абавязкамі, сродкамі і метадамі кіравання мастацкімі калектывамі і інш.

На дваццаці шасці кафедрах універсітэта вядуць навучальную і навукова-даследчую работу 30 прафесараў і дактароў навук, больш за 120 дацэнтаў і кандыдатаў навук. Многія з выкладчыкаў з'яўляюцца лаўрэатамі і дыпламантамі міжнародных і рэспубліканскіх фестываляў і конкурсаў, маюць ганаровыя званні народных і заслужаных.

Важнейшым этапам у жыцці універсітэта стала адкрыццё аспірантуры па навуковай спецыяльнасці “тэорыя, методыка і арганізацыя сацыяльна культурнай дзейнасці”. Зараз аспірантура універсітэта, акрамя вышэйназванай спецыяльнасці, рыхтуе кадры па бібліятэказнаўстве, бібліёграфазнаўстве і кнігазнаўстве, тэорыі і гісторыі культуры, тэорыі і гісторыі мастацтва, музея- знаўстве, кансервацыі і рэстаўрацыі гісторыка-культурных аб'ектаў.

Ва універсітэце працуюць два саветы па абароне доктарскіх дысертацый па спецыяльнасцях “тэорыя і гісторыя культуры”; “тэорыя і гісторыя мастацтва”. За ўвесь перыяд у спецыялізаваных саветах абаронены 62 кандыдацкія дысертацыі і 8 доктарскіх з прысваеннем вучоных ступеней. У ліку апошніх дысертацыі А.І.Смоліка “Дзейнасць сацыякультурных інстытутаў Беларусі ў посткатастрофным соцыуме”, У.Ф.Мартынава “Прыгажосць як феномен культуры”, В.П.Пракапцовай “Мастацкая адукацыя ў Беларусі: сацыякультурны аспект”, Г.С.Мішурова “Беларускае народна-інструментальнае мастацтва: традыцыі і сучаснасць”, Н.П.Яканюк “Народна-інструментальная музычная культура пісьмовай традыцыі ў Беларусі: вопыт сістэмнага аналізу”.

У нашым універсітэце склаліся навуковыя школы, якія атрымалі прызнанне не толькі ў рэспубліцы, але і за яе межамі.Іх узначальваюць аўтарытэтныя ў сваёй галіне вучоныя: доктар педагагічных навук, прафесар В.Е.Лявончыкаў, доктар культуралогіі, прафесар А.І.Смолік, доктар мастацтвазнаўства, прафесар В.П.Пракапцова і інш.

Маючы паліграфічную базу, універсітэт выдае манаграфіі вядучых вучоных, зборнікі навуковых артыкулаў выкладчыкаў, аспірантаў, магістрантаў. З 2002 г. выдаецца навукова-метадычны часопіс “Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў”. Кожны год праводзяцца навуковыя канферэнцыі рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўняў. Напрыклад, ужо 11 гадоў у маі праводзяцца традыцыйныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні.

Вучоныя універсітэта значную ўвагу надаюць навукова-даследчай працы па асноўных кірунках развіцця культуры і мастацтва Беларусі, сучаснай культурнай палітыцы ў новых сацыяльна-эканамічных умовах, сацыякультурнай адаптацыі і сацыяльна-псіхалагічнай рэабілітацыі розных груп насельніцтва постчарнобыльскага соцыуму, захаванню і развіццю нацыянальна-культурных традыцый. Яны прымаюць удзел у распрацоўцы агульнарэспубліканскіх праблем з такімі ўстановамі і арганізацыямі, як Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Беларуская акадэмія мастацтваў, Беларуская акадэмія музыкі, Нацыянальная бібліятэка, выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя» і інш. Толькі за апошнія тры гады навукоўцамі універсітэта было апублікавана навуковых работ агульным аб'ёмам звыш 8 тыс. друкаваных аркушаў, з іх 28 – манаграфій, 324 найменні навукова-метадычных выданняў, 915 артыкулаў.

Дынамічна развіваецца навукова-даследчая і творчая работа студэнтаў. Дзейнічаюць студэнцкія навуковыя аб'яднанні, гурткі, наладжана развітая сістэма студэнцкага самакіравання, працуюць студэнцкі і спартыўны клубы, вучэбна-творчыя лабараторыі і аб'яднанні па інтарэсах, студэнцкі прадзюсерскі цэнтр “Арт-мажор” і інш.

У 2004 г. быў ажыццёўлены першы выпуск літаратурна-мастацкага альманаха “Альфабет”, рэгулярна выдаецца зборнік паэтычных і празаічных твораў выкладчыкаў і студэнтаў–удзельнікаў літаратурнага аб'яднання “БУКет”. Каманда КВЗ БДУ культуры і мастацтваў “Cosa Nostra” з’яўляецца чэмпіёнам вышэйшай лігі Беларускага КВЗ і чэмпіёнам Еўралігі Міжнароднага саюза КВЗ.

Універсітэт мае добрую матэрыяльна-тэхнічную базу. Вучэбныя аўдыторыі размяшчаюцца ў двух карпусах, плошча якіх складае 21 443 кв.м.; функцыянуюць два інтэрнаты, дзе пражываюць каля паўтары тысячы чалавек, сталовая. Падрыхтавана праектная дакументацыя на будаўніцтва спартыўна-культурнага цэнтра.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Універсітэт ганарыцца сваёй фундаментальнай бібліятэкай. На папаўненне яе фондаў кожны год выдаткоўваюцца дастаткова вялікія фінансавыя сродкі з дзяржаўнага бюджэту і са сродкаў, заробленых універсітэтам.

У нашай краіне вядома дзейнасць шматлікіх аркестраў, харавых, тэатральна-драматычных, харэаграфічных, вакальных і інструментальных студэнцкіх калектываў. Фальклорна-этнаграфічныя калектывы “Валачобнікі”, “Талака”, “Грамніцы”, “Баламуты”, ансамблі “Гуды”, “Капрычыо”, “Туцці”, хары “Віват”, “Дабравест”, “Мара”, эстрадна-сімфанічны аркестр, аркестр “Светач” неаднаразова ўдзельнічалі ў міжнародных фестывалях Расіі, Украіны, Эстоніі, Літвы, Венгрыі, Германіі, Францыі, Балгарыі, Галандыі, Італіі, ЗША, Бельгіі і іншых краін свету і станавіліся пераможцамі.

Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў наладжвае і падтрымлівае шырокія міжнародныя стасункі з ВНУ Германіі, Даніі, Польшчы, універсітэтамі культуры і мастацтваў Расіі, Украіны, Інстытутам бібліятэказнаўства і навуковай інфармацыі Варшаўскага універсітэта, Сафійскім універсітэтам, Вяліка-Тырнаўскім універсітэтам імя святых Кірылы і Мяфодзія і інш.

Дасягнутыя поспехі не засталіся без ўвагі дзяржавы. Двойчы, у 1999 і 2000 гадах, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнка наведваў універсітэт, у выніку чаго былі прыняты рашэнні аб умацаванні яго матэрыяльнай базы. Так, нам былі перададзены Маладзёжны тэатр эстрады, Галерэя мастацтваў у Палацы Рэспублікі, памяшканні па вул. Маскоўскай для адкрыцця другога вучэбнага корпуса, створаны навукова-творчыя лабараторыі традыцыйных рамёстваў беларусаў і беларускіх народных музычных інструментаў, студэнцкі эстрадна-сімфанічны аркестр і інш.

Усё вышэйсказанае дазваляе сцвярджаць, што Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў вырас у навукова-педагагічны, сацыякультурны, мастацкі цэнтр, які забяспечвае высокакваліфікаванымі кадрамі шматаспектную сацыякультурную дзейнасць нашай краіны, спрыяючы актыў-наму развіццю Беларусі.

Пажадаем жа яму добрага шляху і творчага плёну ў будучым.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ